# ПРАТАКОЛ ПАСЯДЖЭННЯ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ

27 траўня 2024 года

На пасяджэнні камісіі прысутнічаюць: Андрэй Атаманчук, Алена Філатава, Яраслаў Бекіш, Алена Прыходзька, Дзмітрый Лазавік. Таксама на пасяджэнні прысутнічаюць прадстаўнікі Каардынацыйнай рады, якія аказваюць тэхнічную падтрымку, не прымаюць удзел у абмеркаваннях і не маюць права голасу.

У сілу п. 4.11 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду для прыняцця рашэнняў неабходны кворум павінен складаць 2/3 ад колькасці чальцоў Выбарчай камісіі. Неабходная колькасць сяброў Выбарчай камісіі прысутнічае – 5 чалавек. Кворум выкананы.

Пасяджэнне Выбарчай камісіі аб'яўляецца адкрытым.

**Парадак дня**:

1. Змены ў Пастанове аб зацвярджэнні спісаў кандыдатаў выбарчых суб'ектаў;

- ход выбарчай кампаніі, тэхнічнае супрацьдзеянне; актуальная колькасць галасоў;
- запыты, якія паступаюць у Камісію;
- абвестка пра парадак падвядзення вынікаў выбараў.

2. Тлумачэнне рашэння па спісе кандыдатаў «Наша справа»;
3. Тлумачэнне рашэння аб адмене рэгістрацыі выбарчага суб'екта «Закон і правапарадак»;
4. Разгляд запыту выбарчага суб'екта Блок Прокопьева-Егорова аб змяненні парадку кандыдатаў спіса.

**Разгляд пытання парадка дня.**

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька:

Зацвярджэнне парадку дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 27 траўня 2024 года.

**Прагаласавалі:**

**«За» – 5 галасоў, «Супраць» – 0 галасоў, «Устрымаліся» – 0 галасоў.**

Заўваг ад сяброў выбарчай камісіі не паступіла.

**ВЫРАШЫЛІ:** Зацвердзіць парадак дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 27 траўня 2024 года.

**Разгляд пытання №1.**

***Алена Прыходзька:*** «Са спісу «Наша справа» выбылі Андрэй Жукавец і Віктар Скаскевіч. Таксама ў выбарах больш не ўдзельнічае спіс «Закон і правапарадак». Больш ніякіх істотных зменаў не адбылося.

Наступныя пытанні: як адбываецца працэс галасання, якія былі тэхнічныя праблемы, потым я абвешчу актуальную колькасць галасоў. Ход кампаніі мы ацэньваем як станоўчы, сам працэс ідзе роўна, што паказвае на натуральнасць і тэхнічную ўсталяваннасць. На сённяшні момант у нас не шмат падазроных транзакцый. Поўную справаздачу па колькасці і па сутнасці гэтых падазроных транзакцый мы дадзім пасля сканчэння галасавання. Адным сур’ёзным дзеяннем была DOS-атака на пачатку, як толькі мы запусцілі платформу для выбараў. І на наступны дзень былі звесткі аб тым, што ў беларусаў былі праблемы з доступам да VPN-сэрвісаў. На дадзены момант у нас няма звестак аб перашкодах, каб галасаваць. Таму ўсе беларусы зараз маюць магчымасць прагаласаваць».

***Алена Філатава:*** «Мы адбілі ўсе злачынствы, якія нас накрылі ў гэтай кампаніі. Мне падаецца, што мы вельмі якасна правялі перадвыбарчую кампанію і саму выбарчую кампанію. Для нас вельмі важна зберагаць тую

празрыстасць і ініцыятыву. Мне падаецца, што выбарчая кампанія адбылася».

***Алена Прыходзька: «***Зараз хочу засведчыць, што на бягучы момант у нас выдадзена 4 378 ID-пашпартоў праз дадатак, 5 427 бюлетэняў, прагаласала 5 343 чалавек. Хочу патлумачыць чаму пашпартоў меньш, а бюлетэняў больш: выдадзеныя пашпарты - гэта тыя ID-пашпарты, якія людзі афармляюць сабе праз дадатак, якія яны могуць захоўваць для далейшага. Калі людзі галасуюць праз сайт, то адбываецца верыфікацыя і не ствараецца ID-пашпарт. Таму гэта розніца азначае колькасць людзей, якія прагаласавалі не праз дадатак, а праз сайт. Ёсць надзея, што ў канцы вечару, калі мы спынім галасаванне, яўка будзе зусім іншай.

## Запыты, якія паступаюць у Камісію

***Алена Прыходзька: «***Мы досыць хутка апрацоўваем усе запыты, іх можна падзяліць на 2 катэгорыі:

1. Пытанні, звязанныя з самім працэсам галасавання.
2. Запыты са скаргамі альбо прапановамі ў выбарчы працэс.

На прапанову аб працягненні часу галасавання за кошт часу DOS-атак, вырашылі ў працоўным парадку адмовіць. Так як гэта не форс-мажорныя абставіны, і DOS-атака істотна не паўплывала на магчымасць выбаршчыкаў прагаласаваць. Сёння, у 23.59, у ноль гадзін па менскім часе мы будзем спыняць галасаванне. Калі за гэты час нічога не адбудзецца, што перашкодзіць гэта зрабіць, то ў гэты час галасаванне будзе спынена. Адразу ж будуць абвешчаны лічбы, колькі галасоў аддадзена за кожны спіс, адразу ж будзе размеркаванне мандатаў. 28 траўня ў 11 гадзін адбудзецца прэс-канферэнцыя, на якой мы абвесцім усё, што адбылося і адкажам на ўсе пытанні ад сродкаў масавай інфармацыі, выбарчых суб’ектаў і ўсіх жадаючых».

## Разгляд пытання №2.

**Тлумачэнне рашэння па спісе кандыдатаў «Наша справа»**

***Алена Прыходзька: «***Некалькі чалавек са спісу былі вылучаны. Гэта вызвала незадаволеннасць лідараў спісу, да нас накіроўвалі абскарджаванне. На сайце Каардынацыйнай рады было размешчана наша рашэнне, таксама апублікаваны адказ на гэтую скаргу з абаснаваннем рашэння і дзеянняў. Таму я звяртаю вашу ўвагу: не карыстайцеся інтэрв'ю, звесткамі, якія распаўсюджваюць чальцы спісу аб неправамернасці. Зайдзіце на сайт, прачытыйце наша рашэнне і ўважліва прачытайце адказ на скаргу. І потым рабіце высновы».

## Разгляд пытання №3.

**Тлумачэнне рашэння аб адмене рэгістрацыі выбарчага суб'екта «Закон і правапарадак»**

***Алена Прыходзька: «***Рашэнне па выдаленню гэтага спісу і адказ на скаргу таксама размешчаны на сайце Каардынацыйнай рады. У кампетэнцыю выбарчай камісіі ўваходзіць разгляданне скаргаў у 2-х выпадках:

1. калі яе накіроўвае грамадзянін Рэспублікі Беларусь
2. калі накіроўвае выбарчы суб'ект.

Камісія не разглядае скаргі, калі яны напісаны ў непаважлівай форме».

## Разгляд пытання №4.

**Разгляд запыту выбарчага суб'екта Блок Прокопьева-Егорова аб змяненні парадку кандыдатаў спіса**

***Алена Прыходзька: «***Былі даны прапановы новага парадку спіса, які яны хацелі б бачыць і які адрозніваецца ад зацверджанага. Таксама былі прыведзены довады і меркаванні. Камісія разгледзела пытанне і ўсе спасылкі на пункты Палажэння аб выбарах. Згодна Палажэнню, усе

кандыдаты размешчаны ў парадку іерархіі. Паслядоўнасць з’яўляецца прэрагатывай выбарчага суб’екту (п.6.1.13). Пункт 3.2 прама не прадугледжвае патрабавання выбарчага суб’екта мець у нязменным выглядзе парадак спісу кандыдатаў падчас усёй электаральнай кампаніі. Абавязак прадугледзіць парадак чальцоў спісу вызначаны толькі ў п.6 Палажэння, які тычыцца рэгістрацыі выбарчага суб’екта. Аналіз нормаў Палажэння паказаў, што паслядоўнасць кандыдатаў спісу вызначаецца на этапе рэгістрацыі, павінен захоўвацца ў нязменным выглядзе падчас усіх наступных этапаў выбарчага працэсу. Аб гэтым сведчаць дзве акалічнасці:

1. у адпаведнасці з п.6.1.3 спіс кандыдата павінен быць растаўлены ў парадку прыярытэту атрымання мандатаў.
2. у адпаведнасці з прэамбулай Палажэння рэгуляванне выбарчага працэсу павінна ажыццяўляцца адпаведна стандартам адкрытых, галосных, празрыстых і дэмакратычных выбараў.

Дадзеныя стандарты прадугледжваюць свабоду выбаршчыкаў фармаваць сваё меркаванне згодна п. 3.1. Грамадзяне маюць права на атрыманне дакладнай інфармацыі пра кандыдатаў, выбарчых спісаў і палітычных праграм. Дадзеныя нормы накладаюць абмежаванне на выбарчы суб’ект па ўнясенню зменаў у спіс кандыдатаў. Пераходзім да прыняцця рашэння».

**Прагаласавалі па пытанню адмаўленню запыта выбарчага суб'екта Блок Прокопьева-Егорова аб змяненні парадку кандыдатаў спіса:**
**«За» – 4 галасоў, «Супраць» – 0 галасоў, «Устрымаліся» – 1 голас.**
**ВЫРАШЫЛІ: адмовіць запыт выбарчага суб'екта Блок Прокопьева-Егорова аб змяненні парадку кандыдатаў спіса**
**Вы маеце права абскардзіць рашэнне цягам 48 (сарака васьмі) гадзін з моманту атрымання альбо публікацыі. Рашэнне будзе апублікавана сёння, як і пратакол гэтага пасяджэння.**

**Пасяджэнне абвешчана закрытым.**